МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ОСЕНЬ 1939 ГОДА: КОРЕННОЙ ПЕРЕЛОМ В СУДЬБЕ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА

*Материалы региональной научно-практической конференции, посвященной 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР*




Брест 2009

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ОСЕНЬ 1939 ГОДА: КОРЕННОЙ ПЕРЕЛОМ В СУДЬБЕ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА

Материалы региональной научно-практической конференции, посвящённой 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР

***24-25 сентября 2009 года***

Брест 2009

УДК 947(476)
ББК 63.3(4Бел)61л0

Рецензент:
Галимова Н.П., кандидат философских наук, декан исторического факультета УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

**Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа**: Материалы региональной научно-практической конференции, посвящённой 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР 24-25 сентября 2009 года / Ред. Ковалёва Н.Н., Малыхина Л.Ю. – Брест: БрГТУ, 2009. – 212 с.

**ISBN 978-985-493-130-2**

В сборник вошли материалы региональной научно-практической конференции, посвящённой 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР (сентябрь 2009 года), организованной на базе кафедры социально-политических и исторических наук учреждения образования «Брестский государственный технический университет», с участием Брестской областной организации РОО «Белая Русь».

Опубликованные материалы могут представлять интерес для преподавателей, студентов, всех, кто изучает историю Беларуси межвоенного периода и начала Второй мировой войны в контексте международных отношений. Они могут быть использованы при разработке проблем истории Беларуси новейшего периода, при организации учебного процесса, воспитательных мероприятий и в информационно-пропагандистской работе.

УДК 947(476)
ББК 63.3(4Бел)61л0

**ISBN 978-985-493-130-2**

© Издательство БрГТУ, 2009

дельных обысков, сопровождавшихся грабежами и другими насилиями [7, 60]. Но эшелоны с людьми в массовом порядке стали двигаться не только с Запада на Восток. В западные районы шла масштабная передислокация кадров из Восточной Белоруссии и других регионов СССР. Это были не только руководящие работники, члены партии, но и деятели культуры и здравоохранения, что сыграло свою положительную роль в социально-экономическом развитии региона в будущем. При этом соотношение представителей различных этнических групп в Западной Беларуси изменилось. Эти и многие другие факты говорят о сложности и неоднозначности произошедших событий. Изменения, свершившиеся в последующие десятилетия господства советской власти, были восприняты разными людьми, даже народами, по-разному. Итогом же стало смещение цивилизационного разлома на запад, объединившего белорусский народ в рамках православно-славянской цивилизации.

**Литература**

1. Амельянчук, Н. У цісках галечы і беспрацоўя / Н. Амельянчук // Камуністычная праца. – 1986. – 1 сакавіка.

2. Броўкін, Я.А. Эканоміка Польшчы у 1921 – 1929 гг. / Я.А. Броўкін // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 3. – С. 25 – 31.

3. Гацкая, О.А. Этнические меньшинства Польши / О.А. Гацкая // Этнические меньшинства современной Европы. – М., 1997. – С. 16.

4. Галубовіч, В. І. і інш. Эканамічная гісторыя Беларусі / рэд. В.І. Галубовіч. – М., 1996.

5. Ладысеў, У. Ф. Заходняя Беларусь у 1921 – 1939 гг. / У.Ф. Ладысеў // Беларусь на мяжы тысячагодзяў. – Мн., 2000 . – С. 166 – 179.

6. Eberchardt, P. Przemiany narodowosciowe na Bialorusi. – Warszawa, 1995. – C. 84.

7. Gross, T.J. Revolution from abroad: the Soviet occupation of Polish Western Ukraine and Belorussia. – Princetown, 1987. – S. 60.

8. Jakubowski, Jozef. Stan spoleczno – kulturalny wsi pov. Kobrynskiego. – Warszawa, 1934. – S. 355.

9. Pawlow, J.S. Represje wobiec osadnikow polskich w zachodnich obwodach Bialorusi // Spolecen'stwo bialoruskie, litewskie i polskie na ziemiach polnocno-wschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939-1941. – Warszawa, 1995. – S. 371.

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПОЛЬСКІХ ВАЙСКОВЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ (1921-1939 гг.)

**Вабішчэвіч А. М.**
УО «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

Важнае значэнне ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі, правядзенні дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі займала польская армія. Палякі займалі там прывіле-яванае становішча. Доля беларусаў у 1920–30-я гг. там не пераўзыходзіла 10 %, вагалася ад 4,9 % (1926 г.) да 9,5 %) (1923 г.) [1, 120]. Аднак гэтыя працэнтныя адносіны прызнаюцца заніжанымі, бо беларусы-каталікі атаясамлівалі сябе пераважна з палякамі [2, 71]. Большая доля беларусаў у польскай арміі адзначана ў асобных сучасных польскіх выданнях [3, 17].

Польскае армейскае камандаванне бачыла ў няпольскіх прадстаўніках ненадзейных вайскоўцаў, таму штучна абмяжоўвала іх прысутнасць у розных родах войск. Паводле

распараджэння II аддзела міністэрства вайсковых спраў Польшчы ад 15 мая 1925 г., асабовы склад сувязі, танкавых войскаў, авіяцыі, жандармерыі павінен быў фарміявацца на 100 % з палякаў, часці Корпуса аховы памежжа – на 80%, супрацьпаветраная абарона – на 9 %. Польская армія камплектавалася па экстэрытарыяльнай прыкмеце, таму заходнебеларускіх прызыўнікоў накіроўвалі служыць на тэрыторыю цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы. Польская армія разглядалася ўрадавымі коламі як дзейсны інстытут ажыццяўлення нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва. Аднак польскія ўлады не змаглі забяспечыць выкананне экстэрытарыяльнага прынцыпу камплектавання арміі ў поўным аб'ёме, таму частка мясцовых прызыўнікоў заставалася ў заходнебеларускіх землях. У пяхоце, кавалерыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў ўстаноўлены цэнз беларусаў ў 10 %, у іншых родах войск – 20–25 % [4, 101–102]. У 1934 г. было прынята рашэнне аб устанаўленні нацыянальнага цэнзу ў вайсковых частках ва ўсходніх ваяводствах: у пяхоце і кавалерыі павінна быць ад 70 да 100 % палякаў (для Корпуса аховы памежжа – 80 %), артылерыі – ад 70 да 90 %, жандармерыі і сувязі – 100 %, сапёрных падраздзяленнях – 70 % [1, 107]. Павятовым вайсковым камендатурам Палескага, Навагрудскага, Беластоцкага ваяводстваў прадпісвалася камплектаваць свой склад толькі з прадстаўнікоў рымска-каталіцкага, грэка-каталіцкага ці праваслаўнага веравызнання шляхецкага паходжання. Пераважная большасць беларусаў служыла ў пяхоце, а таксама кавалерыі і артылерыі. У 1938 г. у пяхоце, кавалерыі, артылерыі і сапёрных часцях Корпуса аховы памежжа беларусы складалі 3 % [4, 103, 105]. Паводле падлікаў Ю. Грыбоўскага, пасля праведзенай мабілізацыі ў польскай арміі ў канцы жніўня 1939 г. было каля 70 тыс. беларусаў [2, 160].

У адрозненне ад салдацкага саставу, у афіцэрскім корпусе абсалютную большасць складалі палякі. У 1930 г. у польскай арміі было зафіксавана толькі 6 афіцэраў беларускага паходжання, што было выклікана найперш мэтанакіраванай палітыкай на паступовае выцісканне непалякаў [2, 95]. У 1936 г. міністэрства вайсковых спраў прыняло распараджэнне, паводле якога ў афіцэрскія і падафіцэрскія школы прымаліся толькі палякі [5, 141].

Польская армія выконвала важную ролю ў пашырэнні польскай культуры і мовы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Гэта адбывалася ў ходзе цэлага комплексу адукацыйна-выхаваўчых, прапагандысцкіх мерапрыемстваў з прызыўнікамі і ваеннаслужачымі, якія паходзілі з заходнебеларускіх зямель. Ваенныя колы актыўна ўключаліся ў распрацоўку і ажыццяўленне планаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва, асабліва ў 1930-я гг. Карпусы аховы памежжа і вайсковыя фарміраванні, якія дыслакаваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, праводзілі самастойна і сумесна з дзяржаўнымі структурамі, польскімі грамадскімі арганізацыямі культурна-асветніцкую работу сярод розных катэгорый цывільнага насельніцтва. Выкарыстоўваючы нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, слабую пісьменнасць і адукаванасць прызыўнікоў-беларусаў, павятовыя камендатуры часта запісвалі іх палякамі [6, 13]. Гэтыя этнакультурныя адметнасці ў 1920-я гг. успрымаліся ваенным кіраўніцтвам у якасці спрыяльных фактараў для нацыянальна-культурнай і моўнай асіміляцыі прызыўнікоў-беларусаў. У ходзе ліквідацыі іх непісьменнасці і малапісьменнасці адбывалася паланізацыя, бо разам з авалодваннем польскамоўным пісьмом яны засвойвалі і элементы польскай культуры [7, 141; 8]. Паводле ваеннага кіраўніцтва, за час службы ў прызыўнікоў павінна выхоўвацца пачуццё адданасці краіне і польскія патрыятычныя пачуцці. 30 сакавіка 1927 г. сектар нацыянальнасцей міністэрства вайсковых спраў выдаў камандзірам вайсковых часцей асобнае распара-

джэнне, паводле якога нельга было выдзяляць нацыянальную прыналежнасць салдатаў. Аднак салдаты-непалякі павінны былі вывучаць польскія песні, з імі трэба было праводзіць гутаркі па гісторыі Польшчы. У справаздачах і рапартах 1925–1926 гг. адзначалася, што беларусы вельмі хутка паланізуюцца ў арміі, аднак гэтаму перашкаджалі водпускі салдатаў [5, 142]. У 1927 г. польскі Генеральны штаб у асобнай дырэктыве на адрас кіраўнікоў Карпусоў аховы памежжа рэкамендаваў ажыццяўляць паланізацыю няпольскага насельніцтва.

Армейскія колы імкнуліся з дапамогай разнастайнага арсеналу культурна-асветніцкай працы выконваць значную ролю ў правядзенні нацыянальнай палітыкі сярод няпольскіх прызыўнікоў. Як адзначаў у адным з артыкулаў у 1923 г. капітан С. Чарноўскі, неабходна было прывіць прызыўніку "усведамленне дзяржаўнасці, не забіваючы яго нацыянальнага пачуцця". Забаўляльныя мерапрыемствы, лекцыі для прызыўнікоў на іх роднай мове прызнаваліся недапушчальнымі [9]. Вайсковую службу неабходна было выкарыстоўваць для пераадолення нацыянальнай асаблівасці, рэлігійных антаганізмаў, "адзяржаўлення" салдат іншых нацыянальнасцей і веравызнанняў [1, 158].

Праца з прызыўнікамі ажыццяўлялася пераважна ў клубах (святліцах). Напрыклад, у Брэсцкім павеце ў 1938 г. там наладжваліся курсы з прызыўной моладдзю, разлічаныя на 143 гадзіны. З прызыўнікамі праводзіліся гутаркі наконт характару будучай службы, для іх уголас чыталіся артыкулы з армейскіх перыядычных выданняў ("Żołnierz Polski") ("Польскі салдат"), "Polska Zbrojna" ("Узброеная Польшча") і іншых. У святліцах ствараліся невялікія бібліятэкі з адпаведнай грамадска-палітычнай і пазнавальна-папулярнай літаратурай, частку якой бясплатна раздавалі ў якасці заахвочвання за ўдзел у розных конкурсах. У памяшканнях святліц вывешваліся плакаты з выказваннямі Ю. Пілсудскага, прапагандысцкія стэнды, табліцы, карты. У асобных святліцах выкарыстоўвалі тэхнічныя сродкі – радыёпрыёмнікі, патэфоны з наборам пласцінак з салдацкімі песнямі, а таксама наладжваліся выступленні школьных аркестраў і хораў [10, 13]. Прызыўнікам даводзілі, што яны грамадзяне адной краіны – Польшчы, на карысць якой трэба было самаахвярна служыць. "Кожны польскі салдат павінен быць добрым салдатам, гатовым у кожную хвіліну стаць на смяротную барацьбу з ворагам Польскай дзяржавы, а калі будзе патрэба – праліць кроў і аддаць жыццё на полі славы" [10, 15]. Павятовыя камендатуры на тэрыторыі Заходняй Беларусі часта запісвалі прызыўнікоў беларускай нацыянальнасці палякамі [11, 13].

Нягледзячы на тое, што заходнебеларускія аб'яднанні мелі абмежаваны ўплыў на армейскія фарміраванні, аднак спрабавалі аказваць пэўнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне для салдат-беларусаў. У 1932 г. быў надрукаваны беларускамоўны праваслаўны малітоўнік на кірыліцы і лацінцы (пераклад на беларускую мову ажыццявіў Ф. Акінчыц). Міністэрства вайсковых спраў адзначала, што кірылічны варыянт малітоўніка карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод салдатаў-беларусаў [2, 91]. Аднак у ліпені 1934 г. кіраўніцтва праваслаўнай царквы дало згоду на выданне польскамоўных малітоўнікаў, якія павінны спрыяць далейшай паланізацыі праваслаўных салдатаў. Польскамоўны малітоўнік не атрымаў папулярнасці ў салдатаў-беларусаў. У лістападзе 1935 г. у вайсковых казармах пачаліся першыя богаслужэнні на польскай мове. Адбываўся пераклад літургічных тэкстаў на польскую мову. 1 сакавіка 1936 г. пры падтрымцы міністэрства вайсковых спраў пачалося друкаванне па-польску выдання "Gazeta Prawosławna" ("Праваслаўная газета"), якая павінна была спрыяць інтэграцыі праваслаўнай супольнасці з Польскай дзяржавай і польскай культурай.

распараджэння II аддзела міністэрства вайсковых спраў Польшчы ад 15 мая 1925 г., асабовы склад сувязі, танкавых войскаў, авіяцыі, жандармерыі павінен быў фарміравацца на 100 % з палякаў, часці Корпуса аховы памежжа – на 80%, супрацьпаветраная абарона – на 9 %. Польская армія камплектавалася па экстэрытарыяльнай прыкмеце, таму заходнебеларускіх прызыўнікоў накіроўвалі служыць на тэрыторыю цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы. Польская армія разглядалася ўрадавымі коламі як дзейсны інстытут ажыццяўлення нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва. Аднак польскія ўлады не змаглі забяспечыць выкананне экстэрытарыяльнага прынцыпу камплектавання арміі ў поўным аб'ёме, таму частка мясцовых прызыўнікоў заставалася ў заходнебеларускіх землях. У пяхоце, кавалерыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў ўстаноўлены цэнз беларусаў ў 10 %, у іншых родах войск – 20–25 % [4, 101–102]. У 1934 г. было прынята рашэнне аб устанаўленні нацыянальнага цэнзу ў вайсковых частках ва ўсходніх ваяводствах: у пяхоце і кавалерыі павінна быць ад 70 да 100 % палякаў (для Корпуса аховы памежжа – 80 %), артылерыі – ад 70 да 90 %, жандармерыі і сувязі – 100 %, сапёрных падраздзяленнях – 70 % [1, 107]. Павятовым вайсковым камендатурам Палескага, Навагрудскага, Беластоцкага ваяводстваў прадпісвалася камплектаваць свой склад толькі з прадстаўнікоў рымска-каталіцкага, грэка-каталіцкага ці праваслаўнага веравызнання шляхецкага паходжання. Пераважная большасць беларусаў служыла ў пяхоце, а таксама кавалерыі і артылерыі. У 1938 г. у пяхоце, кавалерыі, артылерыі і сапёрных часцях Корпуса аховы памежжа беларусы складалі 3 % [4, 103, 105]. Паводле падлікаў Ю. Грыбоўскага, пасля праведзенай мабілізацыі ў польскай арміі ў канцы жніўня 1939 г. было каля 70 тыс. беларусаў [2, 160].

У адрозненне ад салдацкага саставу, у афіцэрскім корпусе абсалютную большасць складалі палякі. У 1930 г. у польскай арміі было зафіксавана толькі 6 афіцэраў беларускага паходжання, што было выклікана найперш мэтанакіраванай палітыкай на паступовае выцісканне непалякаў [2, 95]. У 1936 г. міністэрства вайсковых спраў прыняло распараджэнне, паводле якога ў афіцэрскія і падафіцэрскія школы прымаліся толькі палякі [5, 141].

Польская армія выконвала важную ролю ў пашырэнні польскай культуры і мовы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Гэта адбывалася ў ходзе цэлага комплексу адукацыйна-выхаваўчых, прапагандысцкіх мерапрыемстваў з прызыўнікамі і ваеннаслужачымі, якія паходзілі з заходнебеларускіх зямель. Ваенныя колы актыўна ўключаліся ў распрацоўку і ажыццяўленне планаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва, асабліва ў 1930-я гг. Карпусы аховы памежжа і вайсковыя фарміраванні, якія дыслакаваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, праводзілі самастойна і сумесна з дзяржаўнымі структурамі, польскімі грамадскімі арганізацыямі культурна-асветніцкую работу сярод розных катэгорый цывільнага насельніцтва. Выкарыстоўваючы нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, слабую пісьменнасць і адукаванасць прызыўнікоў-беларусаў, павятовыя камендатуры часта запісвалі іх палякамі [6, 13]. Гэтыя этнакультурныя адметнасці ў 1920-я гг. успрымаліся ваенным кіраўніцтвам у якасці спрыяльных фактараў для нацыянальна-культурнай і моўнай асіміляцыі прызыўнікоў-беларусаў. У ходзе ліквідацыі іх непісьменнасці і малапісьменнасці адбывалася паланізацыя, бо разам з авалодваннем польскамоўным пісьмом яны засвойвалі і элементы польскай культуры [7, 141; 8]. Паводле ваеннага кіраўніцтва, за час службы ў прызыўнікоў павінна выхоўвацца пачуццё адданасці краіне і польскія патрыятычныя пачуцці. 30 сакавіка 1927 г. сектар нацыянальнасцей міністэрства вайсковых спраў выдаў камандзірам вайсковых часцей асобнае распара-

джанне, паводле якога нельга было выдзяляць нацыянальную прыналежнасць салдатаў. Аднак салдаты-непалякі павінны былі вывучаць польскія песні, з імі трэба было праводзіць гутаркі па гісторыі Польшчы. У справаздачах і рапартах 1925–1926 гг. адзначалася, што беларусы вельмі хутка паланізуюцца ў арміі, аднак гэтаму перашкаджалі водпускі салдатаў [5, 142]. У 1927 г. польскі Генеральны штаб у асобнай дырэктыве на адрас кіраўнікоў Карпусоў аховы памежжа рэкамендаваў ажыццяўляць паланізацыю няпольскага насельніцтва.

Армейскія колы імкнуліся з дапамогай разнастайнага арсеналу культурна-асветніцкай працы выконваць значную ролю ў правядзенні нацыянальнай палітыкі сярод няпольскіх прызыўнікоў. Як адзначаў у адным з артыкулаў у 1923 г. капітан С. Чарноўскі, неабходна было прывіць прызыўніку "усведамленне дзяржаўнасці, не забіваючы яго нацыянальнага пачуцця". Забаўляльныя мерапрыемствы, лекцыі для прызыўнікоў на іх роднай мове прызнаваліся недапушчальнымі [9]. Вайсковую службу неабходна было выкарыстоўваць для пераадолення нацыянальнай асаблівасці, рэлігійных антаганізмаў, "адзяржаўлення" салдат іншых нацыянальнасцей і веравызнанняў [1, 158].

Праца з прызыўнікамі ажыццяўлялася пераважна ў клубах (святліцах). Напрыклад, у Брэсцкім павеце ў 1938 г. там наладжваліся курсы з прызыўной моладдзю, разлічаныя на 143 гадзіны. З прызыўнікамі праводзіліся гутаркі наконт характару будучай службы, для іх уголас чыталіся артыкулы з армейскіх перыядычных выданняў ("Żołnierz Polski") ("Польскі салдат"), "Polska Zbrojna" ("Узброеная Польшча") і іншых. У святліцах ствараліся невялікія бібліятэкі з адпаведнай грамадска-палітычнай і пазнавальна-папулярнай літаратурай, частку якой бясплатна раздавалі ў якасці заахвочвання за ўдзел у розных конкурсах. У памяшканнях святліц вывешваліся плакаты з выказваннямі Ю. Пілсудскага, прапагандысцкія стэнды, табліцы, карты. У асобных святліцах выкарыстоўвалі тэхнічныя сродкі – радыёпрыёмнікі, патэфоны з наборам пласцінак з салдацкімі песнямі, а таксама наладжваліся выступленні школьных аркестраў і хораў [10, 13]. Прызыўнікам даводзілі, што яны грамадзяне адной краіны – Польшчы, на карысць якой трэба было самаахвярна служыць. "Кожны польскі салдат павінен быць добрым салдатам, гатовым у кожную хвіліну стаць на смяротную барацьбу з ворагам Польскай дзяржавы, а калі будзе патрэба – праліць кроў і аддаць жыццё на полі славы" [10, 15]. Павятовыя камендатуры на тэрыторыі Заходняй Беларусі часта запісвалі прызыўнікоў беларускай нацыянальнасці палякамі [11, 13].

Нягледзячы на тое, што заходнебеларускія аб'яднанні мелі абмежаваны ўплыў на армейскія фарміраванні, аднак спрабавалі аказваць пэўнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне для салдат-беларусаў. У 1932 г. быў надрукаваны беларускамоўны праваслаўны малітоўнік на кірыліцы і лацінцы (пераклад на беларускую мову ажыццявіў Ф. Акінчыц). Міністэрства вайсковых спраў адзначала, што кірылічны варыянт малітоўніка карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод салдатаў-беларусаў [2, 91]. Аднак у ліпені 1934 г. кіраўніцтва праваслаўнай царквы дало згоду на выданне польскамоўных малітоўнікаў, якія павінны спрыяць далейшай паланізацыі праваслаўных салдатаў. Польскамоўны малітоўнік не атрымаў папулярнасці ў салдатаў-беларусаў. У лістападзе 1935 г. у вайсковых казармах пачаліся першыя богаслужэнні на польскай мове. Адбываўся пераклад літургічных тэкстаў на польскую мову. 1 сакавіка 1936 г. пры падтрымцы міністэрства вайсковых спраў пачалося друкаванне па-польску выдання "Gazeta Prawosławna" ("Праваслаўная газета"), якая павінна была спрыяць інтэграцыі праваслаўнай супольнасці з Польскай дзяржавай і польскай культурай.

Асветніцкай працай сярод салдат польскай арміі займаўся створаны ў 1921 г. Вайсковы навукова-выдавецкі інстытут (ВНВІ) (у 1934 г. пераўтвораны ў Вайсковы навукова-асветніцкі інстытут). Галоўнай мэтай ВНАІ быў уздым адукацыйнага і культурнага ўзроўняў, грамадзянскай свядомасці салдат. З канца 1920-х гг. ВНВІ пераўтварыўся з адукацыйна-выхаваўчай структуры ў каардынуючы і арганізацыйны орган прапагандысцкай работы ў польскай арміі. На створаны ў яго межах у чэрвені 1929 г. самастойны сектар прапаганды і армейскай прэсы ўскладваўся цэлы шэраг задач у напрамку правядзення палітыкі "дзяржаўнага выхавання" салдат, пашырэння культа Ю. Пілсудскага. Разам з Дзяржаўным упраўленнем фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі ВНАІ займаўся прапагандай не толькі ў польскай арміі, але і сярод цывільнага насельніцтва. Афіцэраў-культпрасветработнікаў рыхтавалі на асобных курсах [12, 78–98].

З самага пачатку існавання рэжыма "санацыі" у выхаваўчым працэсе салдат утрымліваліся элементы культу Ю. Пілсудскага. Культ асобы Ю. Пілсудскага прысутнічаў у шэрагу агульна дзяржаўных і рэгіянальных святаў, дзе актыўна выкарыстоўвалася дзяржаўная сімволіка, яго партрэты і бюсты [13, 13–14]. Асноўнай формай насаджэння культу Ю. Пілсудскага былі гутаркі з салдатамі. Актыўна выкарыстоўваўся армейскі друк – газеты "Żołnierz Polski", „Wiarus" ("Стары салдат") (для падафіцэраў, друкавалася з 1930 г.). У асобных указаннях была выкладзена методыка падрыхтоўкі і правядзення культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў. Больш інтэнсіўна яго насаджэнне пачалося з пачатку 1930-х гг., а пасля смерці Ю. Пілсудскага гэты працэс значна паскорыўся, уступіў у актыўную стадыю (з публікацыі ВНАІ у 1935 г. працы падпалкоўніка М. Порвіта "Салдацкі дух").

У польскай арміі шырока выкарыстоўваліся для пашырэння культу Ю. Пілсудскага і яго ідэалагічных паплечнікаў дакументальныя кінастужкі "Пахаванне Маршалка Польшчы", "Пахаванне сэрца Маршалка", "Успаміны аб Маршалку Польшчы", "Няхай жыве Маршалак Рыдз-Сміглы" і іншыя. У адной з інструкцый рэкамендавалася ў 1939 г. выхоўваць і вучыць салдата ў нацыянальным (польскім) духу, дабівацца ад яго любові да Польскай дзяржавы, прышчапляць яму культ Ю. Пілсудскага, змагацца з антыдзяржаўнымі ўплывамі асабліва камуністычным, фармаваць у салдата пачуцці адзінства і клопату пра агульны дабрабыт, асуджэння эгаізму і абыякавасці [13, 17]. Аднак у 1938–1939 гг. прапаганда культу Ю. Пілсудскага не мела такога ажыятажнага характару, як ў папярэднія гады.

Акрамя дзяржаўнай адміністрацыі, органаў самакіравання, польская армія была ўцягнута ў прапаганду ідэй дзяржаўнай асіміляцыі [14, 316]. У 1930-я гг. у ходзе выкарыстання сярод салдат розных форм культурна-асветніцкай працы паказвалася культурная вышэйшасць палякаў [15, 229]. Польскія ўлады разглядалі войска як сродак асіміляцыі нацыянальных меншасцей. На ваенных капеланаў ускладалася важная роля ў справе паланізацыі беларусаў, якія прызнаваліся найбольш падатлівымі для яе ажыццяўлення. Гэтая тэндэнцыя асабліва ўзмацнілася ў войску ў другой палове 1930-х гг. Планавалася таксама прапагандаваць пазітыўны імідж польскай арміі пры дапамозе перыядычнага друку, радыё і кіно, кніг, лекцый і іншых форм працы з цывільным беларускім насельніцтвам. Культурна-асветніцкая і выхаваўчая праграма работы з салдатамі мела комплексны характар. У арміі салдатаў знаёмілі з гісторыяй, геаграфіяй Польшчы, для іх праводзілі экскурсіі, яны вучылі польскія песні. Аднак выніковасць паланізатарскіх мер не была здавальняючай. Пра гэта сведчыць данясенне агентуры ІХ Корпуса аховы памежжа (Брэст), якое датуецца 23 снежня 1936 г. "Салдаты-беларусы размаўляюць адзін з другім на сваёй мове. Гэта выклікана тым, што многія з іх дрэнна валодаюць польскай мовай. Такое становішча адрознівае беларусаў ад салдатаў-палякаў, прымушае іх заўсёды трымацца асобна. У сваю чаргу палякі з заходніх ваяводстваў здзекліва адносяцца да бела

рускай мовы. У цэлым, каля 80 % беларусаў ведаюць польскую мову, аднак размаўляюць на ёй з памылкамі" [16, 9]. Наогул, з-за недахопу фінансавых сродкаў, кваліфікаваных кадраў культпрасветработнікаў культурна-асветніцкая работа ў арміі была абмежаванай і зводзілася найперш да ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, вывучэння польскай мовы, маральнага і дзяржаўнага выхавання. Аматарскі тэатральны рух сярод салдат адсутнічаў, уся культурна-асветніцкая праца адбывалася звычайна ў клубах (святліцах).

Польская армія далучалася да правядзення культурна-асветніцкай працы сярод мясцовага цывільнага насельніцтва Заходняй Беларусі шляхам правядзення экскурсій, спартыўных і забаўляльных мерапрыемстваў, аматарскіх тэатральных пастановак, дэманстрацыі фільмаў, праслухоўвання радыё і інш. Напрыклад, жыхары Брэста штогод з 1926 г. збіраліся на святкаванне Купалля на набярэжнай каля Цярэспальскіх варот у Брэсцкай крэпасці, дзе маглі назіраць за арганізаванымі падраздзяленнямі 9 сапёрнага палка воднымі феерыямі на рацэ Заходні Буг [17, 177–178]. Пры непасрэдным удзеле ВНАІ восенню 1936 г. пры Карпусах аховы памежжа былі створаны самастойныя асветніцкія сектары, якія павінны былі кіраваць культурна-асветніцкай працай мясцовай польскай адміністрацыі, грамадскіх устаноў і арганізацый, збіраць і захоўваць звесткі пра грамадскае жыццё на месцах, інфармаваць пра гэта вышэйшыя ваенныя інстанцыі, прапагандаваць ідэі мілітарызму сярод насельніцтва. Названыя сектары актыўна супрацоўнічалі з мясцовымі чыноўнікамі, разнастайнымі праўрадавымі аб'яднаннямі (найперш Стралецкім саюзам, Саюзам польскіх харцэраў і іншымі). Вайсковыя часткі, падраздзяленні Корпуса аховы памежжа займаліся апекай над згаданымі ваенізаванымі маладзёжнымі арганізацыямі.

У правядзенні прапагандысцкай і культурна-асветніцкай работы з польскай арміяй супрацоўнічалі грамадскія арганізацыі былых вайскоўцаў і рэзервістаў. Да майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту з-за ідэалагічнай барацьбы не было адзінай арганізацыі былых вайскоўцаў. Толькі з усталяваннем рэжыма "санацыі" назіралася тэндэнцыя да іх кансалідацыі. У верасні 1927 г. у Вільні быў створаны Саюз арганізацый былых вайскоўцаў. Адпаведная арганізацыя ўзнікла і ў Беластоцкім ваяводстве. Менавіта гэтыя арганізацыі аб'ядналіся ў Федэрацыю польскіх саюзаў абароны Айчыны, якую кантралявалі пілсудчыкі (аб'ядноўвала 37 розных саюзаў – каля 300 тыс. чалавек, пераважна ветэранаў Першай сусветнай і савецка-польскай вайны). У яе склад ўключалі палякаў і прадстаўнікоў іншых этнасаў. З 1922 г. дзейнічаў Саюз афіцэраў рэзерву (каля 15 тыс. чалавек у 1934 г.), Саюз рэзервістаў (былых польскіх вайскоўцаў) (да 24 тыс. чалавек), які ўзначальваў міністр унутраных спраў Польшчы М. Зындрам-Касцялкоўскі, Агульны саюз малодшых афіцэраў рэзерву (у 1926 г. там было каля 40 тыс. чалавек), Саюз польскіх легіянераў (у сярэдзіне 1930-х гг. там было больш 15 тыс. чалавек), які ўзначальваў В. Славэк, адзін з кіраўнікоў лагеру "санацыі", якога Ю. Пілсудскі лічыў магчымым спадкаемцам і якога незадоўга да сваёй смерці прызначыў прэм'ер-міністрам. Саюз рэзервістаў праводзіў на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства акцыю дзяржаўнай асіміляцыі сярод нацыянальных меншасцей. Быў створаны шэраг аддзелаў арганізацыі з адчувальнай доляй беларусаў і літоўцаў. У Беластоцкім і Ваўкавыскім паветах Саюз рэзервістаў значна аслабіў уплыў ТБШ, супрацоўнічаў са Стралецкім саюзам і іншымі праўрадавымі грамадскімі арганізацыямі, актывізаваў культурна-асветніцкую работу [18, 11].

**Літаратура**


1. Kowalski, T.A. Mniejszości narodowe w Siłach Zbrojnych Drugiej Rzeczypospolitej Polskiej (1918–1939) / T.A. Kowalski. – Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 1997. – 183 s.
2. Грыбоўскі, Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях 1918–1945 / Ю. Грыбоўскі. – СПб.: Неўскі Прасцяг, 2006. – 832 с.

3. Mniejszości narodowe i wyznaniowe w siłach zbrojnych Drugiej Rzeczypospolitej 1918–1939: zbiór studiów / pod. red. Z. Karpusa i W. Rezmera. – Toruń: Wydawnictwo Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2001. – 422 s.
4. Waszkiewicz, Z. Duszpasterstwo w siłach zbrojnych Drugiej Rzeczypospolitej (1918–1939) / Z. Waszkiewicz. – Toruń: Wydawnictwo A. Marszałek, 2000. – 357 s.
5. Gomółka, K. Białorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka. – Gdańsk: Wydawnictwo Politechniki Gdańskiej, 1992. – 179 s.
6. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 364. Справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення аб грамадска-палітычным руху (чэрвень-верасень 1923 г.).
7. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 365. Справаздачы і данясенні Палескага ваяводскага ўпраўлення аб грамадска-палітычным руху (кастрычнік-лістапад 1923 г.).
8. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 762. Справаздачы аб правядзенні Дня нараджэння Ю. Пілсудскага на тэрыторыі IX КАП (30.04.1923 г.).
9. Czarnowski, S. Mniejszości narodowe w armii polskiej / S. Czarnowski // Kurier Polski. – 1923. – № 30 (1 lutego)
10. Wieczory świetlicowe. – 1938. – № 11.
11. Odziemkowski, J. Wieś i armia w II Rzeczypospolitej / J. Odziemkowski; Polska Akademia Nauk. Komitet Nauk Historycznych. – Wrocław-Warszawa-Kraków: Wydawnictwo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1988. – 151, [4] s.
12. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. – Zespół 9/1. – Sygnatura 173.
13. Cichoracki, P. „Z nami jest On": kult Marszałka Józefa Piłsudskiego w Wojsku Polskim w latach 1926–1939 / P. Cichoracki. – Wrocław: Towarzystwo Przyjaciół Ossolineum, 2001. – 151 s.
14. Kaszuba, E. System propagandy państwowej obozu rządzącego w Polsce w latach 1926 – 1939 / E. Kaszuba. – Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 2004. – 411 s.
15. Wyszczelski, L. Oświata, propaganda, kultura w Wojsku Polskim w latach 1918–1945 / L. Wyszczelski. – Warszawa: Wydawnictwo „Neriton", 2004. – 318 s.
16. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 2214. Данясенне Брэсцкай інфармацыйнай агентуры аб выкарыстанні салдатамі рускай нацыянальнасці роднай мовы (1936 г.).
17. Ващукувна-Каменецка, Д. Брест – город незабываемый / Д. Ващукувна-Каменецка. – Брест: Изд-во С. Лаврова, 1999. – 284 с.
18. Archiwum Państwowe w Białymstoku. – Zespół 47. – Sygnatura 88.

## БРЕСТСКИЙ СВЯТО-НИКОЛАЕВСКИЙ ПРИХОД В 1920-х – 1930-х гг.

**Восович С.М.**
УО «Брестский государственный технический университет»

После советско-польской войны 1919–1920 гг. постепенно налаживалась жизнь в новообразованной Речи Посполитой. Так как в границах Польского государства проживало большое количество православного населения, то для духовного окормления их была образована Варшавская епархия.

Постепенно восстанавливалась православная жизнь и в г. Бресте. Вначале Бресткий повет входил в состав Гродненской епархии, а с сентября 1922 г. – в Полесскую епархию, с центром в г. Пинске. В возрождении православия в рассматриваемый период большая заслуга принадлежала священно-и церковнослужителям, часть из которых вернулась из